

ШКОЛА БУДУЧЫНІ: БЕЗ «ФІЗІКАЎ» І «ЛІРЫКАЎ»
ЧЫРВОНКА

МАДЭЛЬ ЖЫЦЦЯ. ЯК НЕ ЎПУСЦІЦЬ МАГЧЫМАСЦІ
ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 ВЕРАСНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 171 (29285)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь:**

*«У Беларусі ідзе работа над канстытуцыйнай рэформай. Ужо пра папярэдні як мінімум два варыянты дакладвалі кіраўніку дзяржавы. Створана рабочая група, ідзе падрыхтоўка канкрэтных паправак да дзеючай Канстытуцыі. Вядома ж, будзе праходзіць грамадскае абмеркаванне паправак з усімі катэгорыямі насельніцтва. Мы лічым, што гэта самы аптымальны варыянт, не парушаючы дзеючага заканадаўства, не парушаючы дзеючага Асноўнага закона, арганізаваць нармальны, рабочы дыялог грамадства, які прывядзе ў канчатковым выніку да стабілізацыі сітуацыі, дэскалацыі тых працэсаў, якія, на жаль, сёння адбываюцца».*

# Несці слова пра мір



Фота БелТА.

**Удзельнікаў XXVII Навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» вітаў епіскап Веньямін, які абраны мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, у сталічным Свята-Духавым кафедральным саборы пасля традыцыйнага малебну напачатку маршруту.**

СТАР. 3

## КОРАТКА

- Новы Кодэкс аб адукацыі плануюць унесці восенню на разгляд у парламент.
- **Абноўленую станцыю газазабеспячэння адкрылі ў Бялынічах.**
- Чэмпіянат свету па веласпорце на шашы 2020 года прыме Італія.
- **Новую аўтадарогу адкрылі ў Віцебску.**
- Ваенныя Беларусі і Расіі абмеркавалі падрыхтоўку да сумесных вучэнняў.
- **У Беларусі распрацаваны Нацыянальны план дзеянняў па энергаэфектыўнасці да 2030 года.**
- Палескі драмтэатр пакажа «Вія» на фестывалі ў Смаленску.
- **На Мінскай ЦЭЦ-3 запусцілі два электракатлы.**

На слыху

## НІЯКАГА АЖЫЯТАЖУ Ў АБМЕННІКАХ НЯМА

### Валюта пачала таннець. Можа, у людзей грошы скончыліся?

**Нагадаем, што попыт на валюту ў нашай краіне пачаў расці з апошняй дэкады ліпеня. Да сярэдзіны жніўня тэндэнцыя стала пагрозлівай, пасля чаго насельніцтва прадказальна кінулася ў абменнікі. Валюты стала не хапаць, пасля чаго яна пачала даражэць яшчэ хутчэй.**

**Вось тады Нацбанк рэкамендаваў камбанкам забяспечыць абменнікі валютай і ўзважана падыходзіць да курсаў. Спецыялісты рэгулятара адзначалі, што праблема з дэфіцытам наяўнай валюты ў некаторых банках носіць тэхнічны характар і ён звязаны з фізічнай адсутнасцю купюр з прычыны вялікага попыту. Прайшло менш за тыдзень, што змянілася на валютным рынку?**

Аўтар гэтых радкоў спецыяльна абабег каля двух дзясяткаў сталічных абменнікаў у розных раёнах горада. І ўсюды валюта была. Акрамя таго, з соткі «зялёных» можна прадаць хоць пяцьдзясят долараў, хоць пяцёрку. Рэшту атрымліваеш без праблем, валюты ў абменніку зараз хапае. А яшчэ на мінулым тыдні мне ўдалося здаць 20 долараў з 50, не было рэшты. Тады касір сказала, што прадавалі толькі тую валюту, якую здалі напярэдадні.

СТАР. 3

Лесвіца ў неба

## Узняты з попелу

**У лёсе маленькай вёскі Дарава пад Ляхавічамі, нібы ў люстэрку, адбіваецца гісторыя ўсёй беларускай зямлі. Не раз Дарава спусташалі разбуральныя войны, але кожны раз яна ў прамым сэнсе адраджалася з попелу. І сёння, як і амаль 600 гадоў таму, у яе цэнтры на пагорку ўзвышаецца касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Раз за разам яго адбудоўвалі прыхаджане: некалькі разоў — з дрэва, а ў 1938 годзе — з цэглы.**

СТАР. 13



Бюст айцу Станіславу. Вернікі вёскі Дарава і сёння памятаюць свайго духоўнага папячыцеля.

ISSN 1990 - 763X

20171>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА